

*Гасцініца «Віцебск» у Віцебску.*

**ГАСЦІ́НІЦА**, тып жылой архітэктуры; будынак ці архіт. комплекс, прызначаны для часовага пражывання

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

людзей з забеспячэннем іх мін. спажывецкіх патрэб. У Беларусі ў 19 ст. прататыпам Г. была — *карчма* з заездам (напр., корчмы «Раскоша» і «Галеча» ў Гродне). У канцы 19 — пач. 20 ст. ў губернскіх гарадах будавалі Г. (да 49 нумароў) у комплексе з карчмой і рэстарацыямі («Еўропа», «Адэса», «Новамаскоўская», «Гарні» ў Мінску). У пач. 20 ст. ў Мінску пабудаваны шэраг невял. Г. (ад 5 да 20 нумароў): «Раяль», «Рыга», «Бельвю», «Палтава», «Кранштат», «Стара-Берлін», «Нова-Берлін», «Маскоўская», «Пецярбургская», «Гранд Атэль», «Нова-Варшава» і інш. У 1930—50-я гг. маштаб Г. узбуйніўся, яны сталі выразнымі акцэнтамі вуглоў перакрыжаванняў транспартных артэрый, горадабуд. вузлоў («Свіслач» у Мінску, «Буг» у Брэсце). У 1950—80-я гг. ў вял. гарадах ўзводзіліся Г. з аднайм. назвай («Бабруйск», «Віцебск», «Магілёў», *«Гродна»*), былі створаны шматпавярховыя рэстаранна-гасцінічныя комплексы («Юбілейная», *«Планета»*, *«Беларусь»*, усе ў Мінску), пансіянаты каля вадасховішчаў («Маладосць» каля Заслаўскага вадасховішча). У 1990—2000-я гг. з'явіліся камфартабельныя 4-зоркавыя Г. («Лучоса» ў Віцебску), 5-зоркавыя (*«Еўропа»*, «Crowne Plaza» ў Мінску), пабудаваны прыдарожныя Г. (в. Пасенічы Пінскага р-на), матэлі (в. Валяр'яны Уздзенскага р-на), кэмпінгі («Дубы» на беразе р. Нёман Мастоўскага р-на), Г. ў складзе спарт. комплексаў (*«Сілічы»* Лагойскага р-на), у гар. пасёлках («Мір» у г.п. Мір Карэліцкага р-на), аграгарадках («Арэса» ў аграгарадку Сарачы Любанскага р-на). *Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ